## СТАН КУЛЬТУРНАЙ СПРАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914 – ЛЮТЫ 1918 г.)


**В. С. Грэсь**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*gres.veronika@yandex.ru;*
*навук. кір. – А. В. Бурачонак, канд. гіст. навук, дац.*



Развіццё культуры на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны было няпростым. Увядзенне ваеннага становішча, нямецкае наступленне вясной 1915 года, а потым падзел беларускіх зямель на дзве часткі – гэтыя абставіны прывялі да таго, што становішча ў культурнай сферы заходняй і ўсходняй частак тэрыторыі Беларусі было не аднолькавым. На акупіраваных землях хоць культура і развівалася пад нямецкім пачаткам, але ўпор быў зроблены на развіццё беларускай культуры, беларускай мовы з мэтай знізіць расійскі ўплыў на гэтыя тэрыторыі і выкарыстаць ў далейшым заходнебеларускія зямлі ў сваіх інтарэсах. На ўсходняй частцы тэрыторыі Беларусі, якая засталася ў сферы расійскага ваеннага камандавання, развіццё беларускай культуры ішло ў іншым кірунку і мела свае асаблівасці. Аб’ектам даследавання з’яўляецца беларуская культура ў перыяд са жніўня 1914 г. да лютага 1918 г. Мэта працы – выявіць на аснове параўнання акупіраванай і неакупіраванай частак беларускіх зямель адметнасці культурнай справы на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Напярэдадні стагоддзя са дня заканчэння Першай сусветнай вайны і 100-гадовай гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі актуалізуецца праблема развіцця беларускай культуры ў гады Першай сусветнай вайны. Усебаковае і аб’ектыўнае вывучэнне кірункаў культурнага развіцця дапаўняе навуковыя веды пра грамадска-палітычныя і сацыяльна-культурныя працэсы, дазваляе больш глыбока зразумець і прааналізаваць змены ў грамадстве, якія адбываліся ў часы ваенных і рэвалюцыйных узрушэнняў, а таксама дапамагае асэнсаваць яшчэ адну невядомую старонку ў беларускай гісторыі і гісторыі беларускага народа.



***Ключавыя словы***: стан культурнай справы; культурнае жыццё; Беларусь; Першая сусветная вайна; дзеячы нацыянальнай інтылігенцыі.


Першая сусветная вайна стварыла няпростыя ўмовы для развіцця беларускай культуры. У ліпені 1914 года ў беларускіх губернях было ўведзена ваеннае становішча, перыядычны друк і культурныя ўстановы былі ўзяты пад кантроль. Але, нягледзячы на кантроль і складаныя ваенныя абставіны беларускія газеты не спынілі сваю дзейнасць. Газета «Наша Ніва» выходзіла да 1915 года, пакуль нямецкія войскі не занялі заходнюю частку Беларусі і з’ўлялася галоўным распаўсюджвальнікам ідэй нацыянальнага адраджэння ў народныя масы. Акрамя «Нашай Нівы» у пачатку вайны на беларускіх землях выходзілі часопісы «Лучынка» і «Саха», а таксама газета «Беларускі каляндар». Усе яны –

«Наша Ніва», «Лучынка», «Беларус» прытрымліваліся памяркоўных антываенных пазіцый, а таксама імкнуліся да абуджэння ў народа нацыянальнай годнасці і адзінства. Гэта былі першыя спробы духоўнага адраджэння ў свядомасці беларускага насельніцтва Расійскай імперыі.

Нямецкае наступленне вясной 1915 года падзяліла тэрыторыю Беларусі на дзве часткі: заходнія беларускія землі часткова ўвайшлі ў склад акупацыйнай зоны «Обер Ост», часткова апынуліся пад юрысдыкцыяй армейскіх груп Войрша, Буг, Гранаў, частка стала вайскова-аперацыйнай паласой германа-расійскага фронту і знаходзілася пад кантролем штабоў асобных армій, а ўсходнія засталіся ў складзе Расійскай імперыі.

Першапачаткова ўся культурная дзейнасць на акупіраванай тэрыторыі Беларусі была забаронена. Аднак невялікая група беларускіх дзеячаў, якія засталіся ў акупіраванай Вільні працягвала працу ў гэтым кірунку.

Культурную праграма, якую распачалі нямецкія акупацыйныя ўлады Х. Земке назваў «Паварот на Захад». Дадзеная праграма мела дзве мэты: не дапусціць культурны ўплыў Расіі на беларускія, літоўскія, латышскія і ўкраінскія землі і стварыць новую сістэму афіцыйнай ідэалогіі, якая б прапагандавала нямецкі лад жыцця, фарміравала ў масавай свядомасці мясцовага насельніцтва станоўчы вобраз Германскай імперыі. 7 чэрвеня 1916 года фельдмаршал П. фон Гендэнбург выдаў загад аб кіраванні землямі «Обер Ост», у якім беларуская мова аб’яўлялася раўнапраўнай з польскай і яўрэйскай. Такія паслабленні падштурхнулі дзеячаў беларускай інтылігенцыі да разгортвання нацыянальнай працы.

З 15 лютага 1916 г. пад рэдакцыяй В. Ластоўскага ў Вільні стала выходзіць беларуская газета «Гоман». Першапачатковы дазвол на выданне «Гоману» нямецкімі акупацыйнымі ўладамі быў дадзены пры ўмове друкавання яго лацінкай, таму першыя нумары газеты выйшлі менавіта на ёй. Але хутка газета пачала друкавацца ў двух асобных выданнях – лацінкай і кірыліцай [1, арк. 17].

Лічачы найвышэйшай каштоўнасцю для вольнага грамадзяніна нацыянальную незалежнасць, «Гоман» сваімі публікацыямі падводзіў беларускае насельніцтва да ўспрымання гэтага. Роля «Гоману» была вялікай яшчэ таму, што сам факт выдання беларускай газеты паказаў як акупацыйным уладам, так і іншым нацыянальнасцям, якія жылі ў гэтым рэгіёне, што беларуская нацыя існуе не толькі ў асобе групы дзеячаў-інтэлігентаў, але і сярод той мільённай беларускамоўнай супольнасці, якая пражывае пераважна ў сельскай мясцовасці.

Улетку 1916 года ў Вільні пачаў працу Беларускі Клуб, у межах якога збіраліся беларускія дэмакратычныя элементы Вільні. Тут знайшоў

прыпынак і беларускі хор, і дружына музычна-драматычнага гуртка. Кожную нядзелю ў межах Беларускага Клуба адбываліся вясёлыя вечарыны, на якіх танцавалі беларускія танцы і спявалі песні [2, арк. 16].

Станаўленне віленскага нацыянальнага тэатр звязана з імем Ф. Аляхновіча, што спалучаў у сабе таленты драматурга, рэжысёра і акцёра. У аснове рэпертуару былі п'есы самога Ф. Аляхновіча – «На Антокаллі», «Бутрым Няміра», «Манька», Я. Купалы – «Паўлінка». 13 кастрычніка 1916 г. газета «Гоман» у артыкуле «Беларускі тэатр» паведамляла, што ў нядзелю 15 кастрычніка ў зале Рабочага клуба драматычным калектывам пад кіраўніцтвам рэжысёра Ф. Аляхновіча быў пастаўлены спектакль па п'есе Э. Ажэшка «Хам». Спектакль так спадабаўся публіцы, што акцёры яшчэ не адзін раз выходзілі на сцэну пасля закрыцця занавесу пад бурныя апладысменты гледачоў [3, с. 44].

Акрамя тэатра, у Вільні ў гэты час былі адчынены беларуская бібліятэка, кнігарня, кааператыўнае таварыства «Раніца», якое было яшчэ закладзена да вайны расійскімі ўладамі, дзіцячы прытулак «Золак», «Навуковае таварыства», «Беларускі настаўніцкі саюз», якія значна паспрыялі кансалідацыі нацыянальных сіл [4, с. 126].

З дазволу нямецкіх акупацыйных улад на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ладзіліся розныя выставы. Мэтай дадзеных мерапрыемстваў было паказаць, як нямецкая ваенная адміністрацыя праводзіць с мясцовым насельніцтвам нацыянальна-культурную працу і такім чынам падтрымлівае кантакты з насельніцтвам, клапоціцца аб яго нацыянальна-культурнай свядомасці. У 1918 г. пры ўдзеле «Газеты 10 Арміі» праводзілася выстава беларускага мастацтва, якая даволі шырока і markнабакова адлюстроўвала мастацкае рамяство мінулых часоў. На ёй былі прадстаўлены рэліквіі сярэднявечча, у тым ліку каштоўныя рэчы князёў, слуцкія паясы, вырабы з жалеза, рукапісныя кнігі, сярод якіх «Статут Вялікага княства Літоўскага» (1588) [5, с. 45].

Якасныя змены ў развіцці беларускай культуры на неакупіраваных беларускіх землях адбыліся ў 1916 – пачатку 1917 гг. Маладая беларуская інтылігенцыя пачала аб'ядноўвацца ў розныя культурна-асветніцкія арганізацыі. Асноўнымі цэнтрамі такіх аб'яднанняў былі «беларускія хаткі». Звычайна па суботах у іх адбываліся доўгія вечарыны, на якіх абмяркоўваліся палітычныя пытанні, разбіраліся і асэнсоўваліся беларускія нацыянальныя справы. Часта арганізоўваліся спектаклі і іншыя культурна-асветніцкія мерапрыемствы [4, с. 47].

Беларускімі нацыянальнымі дзеячамі была праведзена пэўная работа па вывучэнню і захаванню помнікаў гісторыі і культуры. У сакавіку 1916 года ў Мінску пры Цэнтральным гарадскім камітэце па ініцыятыве мастака К. Біске быў створаны «Аддзел апекі над помнікамі мастацтва і

культуры». Члены аддзела арганізавалі сховішчы, куды звозіліся калекцыі твораў мастацтва, бібліятэкі і архівы. У лістападзе 1916 года ў Мінску па ініцыятыве аддзела праводзіліся выстаўкі [6, с. 55].

Паступова беларускі культурны рух распаўсюдзіўся і на бежанскія масы. У многіх расійскіх гарадах, Петраградзе, Саратаве, Яраслаўлі, пачалі ствараецца беларускія бежанскія камітэты, у якіх праводзілася нацыянальна-культурная работа.

Для каардынацыі дзеянняў і падтрымкі сувязей дзеячы нацыянальнага руху пачалі выданне на ўсходніх беларускіх землях дзвюх газет – «Дзянніца» і «Светач». Яны выходзілі кароткі час, але за гэты перыяд рэдактарам удалося згуртаваць вакол газет беларускія бежанскія масы, раскіданыя па ўсіх кутках Расійскай Імперыі і ў першую чаргу беларусаў прыфрантавой Мінскай губерні, а таксама звярнуць на сябе ўвагу народных мас, выконваючы функцыю з'яднання беларускага насельніцтва Расійскай Імперыі.

Лютаўская рэвалюцыя дала штуршок да далейшай актывізацыі беларускага нацыянальна-культурнага руху. Па ініцыятыве Беларускага Нацыянальнага Камітэта (БНК) для каардынацыі намаганняў і згуртаванню сіл творчай інтылігенцыі для развіцця беларускай культуры і мастацтва было створана Таварыства беларускай культуры. 24–26 чэрвеня 1917 г. Таварыства правяло Дні вольнай Беларусі. Гэта шырокая акцыя, якая павінна была ахапіць насельніцтва краю і ўсіх беларусаў па-за яго межамі і згуртаваць іх пад сцягам нацыянальнага адзінства. У снежні 1917 года ў Бабруйску было заснавана Беларускае культурна-асветнае таварыства, якое паставіла сабе мэту развіваць беларускую культуру і нацыянальна-культурную свядомасць беларускага народа [7, с. 39].

28 мая 1917 года ў Мінску пачала выходзіць газета «Вольная Беларусь», як тыднёвік БНК. Яе рэдактарам быў Я. Лёсік. Акрамя «Вольнай Беларусі» ў Мінску ў 1917 годзе пачала выходзіць вайскова-грамадская і літаратурная газета «Беларуская рада» – орган выканаўчага камітэта Цэнтральнай Беларускай вайсковай рады [8, с. 64].

У справе пашырэння самасвядомасці беларускага народа моцным сродкам працы з'яўляўся беларускі тэатр. У красавіку 1917 года ў Мінску па ініцыятыве І. Буйніцкага быў заснаваны першы нацыянальны беларускі тэатр пад назвай «Першае беларускае таварыства драмы і камедыі». У 1917–1920 гг. яго мастацкім кіраўніком і рэжысёрам быў Фларыян Ждановіч. 1 мая 1917 г. артысты «Першага беларускага таварыства драмы і камедыі» паставілі на сцэне губернскага тэатра «Паўлінку» Я. Купалы і «Зімовы вечар» паводле Ажэшкі. У 1917 годзе ў Мінску ўзнік беларускі маладзёжны гурток «Вянок», які праз некаторы

час быў рэарганізаваны ў агульнанацыянальнае таварыства «Беларуская вучнёўская грамада». Яна складалася з некалькіх гурткоў, найбольшую актыўнасць сярод якіх праяўляў драматычны пад кіраўніцтвам А. Андрэева. Гэты самадзейны калектыў выступаў са спектаклямі ў «Беларускай хатцы», дзе паказваў мінскаму гледачу п'есу Я. Коласа «Антось Лата», А. Чэхава «Мядзведзь» і шмат іншых. Тэатральнае жыццё развівалася не толькі ў буйных населеных пунктах, але і ў больш дробных – мястэчках. У мястэчку Будслаў быў заснаваны культурна-асветніцкі гурток «Вяночак». Яго першым спектаклем была мініяцюра Валодзькага «Як яны жаніліся» [8, с. 68].

Такім чынам, з сярэдзіны 1916 г. мы можам назіраць, як беларуская справа ў культурнай сферы пачынае сваё развіццё як на акупіраваных беларускіх землях, так і неакупіраваных. Першая сусветная вайна і яе складаныя ўмовы падштурхнулі дзеячаў беларускай нацыянальнай інтылігенцыі да актыўнай работы ў гэтай галіне. Але, нельга казаць аб поўным нацыянальным адраджэнні пад час Першай сусветнай вайны. У жорсткіх ваенных умовах яго проста не магло існаваць, яно адбывалася ўжо пасля заканчэння вайны. Безумоўна нельга адмаўляць карысць выпуску беларускіх газет, стварэнне беларускага тэатру і наладжванне беларускіх выстаў для самасвядомасці беларусаў і распаўсюджвання беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў цэлым, але адраджэннем гэта ўсе можна называць умоўна. Хутчэй гэта быў першы крок да абуджэння ў беларусаў пачуцця чалавечай годнасці – права на ўласны незалежны быт і падмурак для далейшага нацыянальнага культурнага адраджэння.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). Ф. 3. Воп. 1. Спр. 48. Артыкул А. Луцкевіча «Прызнанне правоў беларускай мовы пры нямецкай акупацыі падчас Першай сусветнай вайны».
2. БДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 52. Артыкул А. Н. (А. Луцкевіча) «"Унутраная праца" аб дзейнасці беларускіх арганізацый ва ўмовах нямецкай акупацыі».
3. *Шчаўлінскі М. Б.* Першая сусветная вайна і развіццё беларускай нацыянальнай культуры // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. Мінск, 2013. Вып. 11, т. 2. С. 19–25.
4. *Цуба М. В.* Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 – люты 1917 гг.). Брэст : Выдаведства С. Лаўрова, 2003.
5. *Резник А. Н.* Характер белорусско-немецкого взаимодействия в области культуры и науки в период Первой мировой войны (1914–1918) // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. Мінск, 2007. Вып. 6. С. 40–51.
6. *Щавлинский Н. Б.* Государственно-политическое и национально-культурное самоопределение Беларуси в годы Первой мировой войны (1914–1918 гг.). Минск : Мэджик Бук, 2009.
7. *Шчаўлінскі М. Б.* Беларуская культура ў гады Першай сусветнай вайны (1914–1918). Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
8. *Калубовіч А. Т.* Крокі гісторыі. Беласток – Вільня – Мінск, 1993.